Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за снежань 2015 г.

## Мерапрыемствы ў рамках Года Моладзі

**17 снежня**

На ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным зачыненню працоўнага семестра «Маладосць. Праца. Рамантыка», падвядзенню вынікаў Года моладзі прысутнічала моладзь кобрыншчыны. Самыя актыўныя члены арганізацыі атрымалі ўзнагароды з рук начальніка аддзела ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Н. В. Жук. Ініцыятар мерапрыемства - 1 сакратар Кобрынскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання БРСМ Л. Чырун.

ЦБ, 92 чал.

**21 снежня**

Свята «Моладзь на бібліятэчным пастаменце» з'явілася падвядзеннем вынікаў раённага конкурсу «Молодой читатель – 2015», якое праходзіла на працягу года ў бібліятэках Кобрынскай РЦБС і завяршыла Год моладзі. У зале бібліятэкі сабраліся 16 пераможцаў конкурсу – вучняў сярэдніх школ, студэнтаў вышэйшых і сярэдніх устаноў, маладых спецыялістаў, працоўных і службоўцаў. Госці, старшыня Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта А.І. Зазуля, начальнік аддзела ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Н.В. Жук, 1 сакратар Кобрынскай раённай арганізацыі ГА «БРСМ» Л.У. Чырун выступілі з віншавальным словам для чытальнай моладзі.

ЦБ, 52 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках Сусветнага Дня прафілактыкі СНІДу

**01 снежня**

У Кобрынскім ліцэі сферы абслугоўвання адбылося пасяджэнне клуба «Час і ты», прызначанае да сусветнага Дня прафілактыкі СНІДу «Радость жизни с привкусом горечи». З дапамогай мультымедыйнай прэзентацыі паказаны выпадкі заражэння СНІДам, вынікі хваробы. Прыведзены даныя статыстыкі пра хворых СНІДам. Удзельнікі пасяджэння прынялі актыўны ўдзел у віктарыне, пераможцы атрымалі прызы.

ЦРБ, 28 чал.

**01 снежня**

Вусны часопіс «Расплата за безволие». На чарговае мерапрыемства бібліятэкі, прысвечанае сусветнаму Дню прафілактыкі СНІДу, сабраліся вучні 10-11 класаў. Супрацоўнікам бібліятэкі падрыхтавана тэматычная выстава «СПИД: знать и предупреждать», якая змяшчае карысны матэрыял па адной з самых страшных хвароб 21 стагоддзя. Дзеці жыва рэагавалі на актуальную тэму гутаркі «Всем миром против СПИДа» і актыўна адказвалі на пытанні прапанаванай бібліятэкарам віктарыны «Как уберечь себя от СПИДа».

Лелікаўская СБ, 10 чал.

**02 снежня**

На інфармацыйнай гадзіне «СПИД без мифов и иллюзий» у бібліятэцы прысутнічалі прадстаўнікі моладзі. Падлеткам паказаны відэаролік «СПИД видео», у якім даступна і наглядна распавядалася аб тым, што такое вірус імунадэфіцыту чалавека, чым ён небяспечны і расказаны метады прафілактыкі хваробы. Зацікаўленнасць у прысутных вызвала кніжная выстава «Молодёжь против СПИДа и наркотиков».

Восаўская СБ, 12 чал.

**02 снежня**

Для вучняў 10-11 класаў арганізавана Астроміцкай СШ выступленне ЛПГ з праграмай «СПИД не выбирает – выбираете вы». Дадзена інфармацыя па Кобрынскаму раёну па ўжыванні наркатычных сродкаў. З газеты «Кобрынскі веснік» зачытаны рэальныя гісторыі маладых людзей, якія даўно ужываюць наркатычныя і псіхатропныя сродкі. У канцы мерапрыемства адбыўся прагляд відэафільма «Во все колокола. Наркомания. Правда о белой смерти».

Астроміцкая СБ, 14 чал.

**02 снежня**

На выступленні ЛПГ «ВІЧ – страхоўка яшчэ не дана» мясцовая моладзь пазнаёмілася з матэрыяламі па пытаннях СНІДу. Працаўнік бібліятэкі запрасіла фельчара Лукскай амбулаторыі Кушнер І.А., якая расказала аб сітуацыі па Кобрынскаму раёну і якія праводзяцца мерапрыемствы, дапамагаючыя пазбягаць хваробы і змагацца з рознымі крызіснымі сітуацыямі, павысіць якасць свайго жыцця. Пад канец мерапрыемства чытачам прадэманстраваны відэаролік на гэтую тэму «Открой глаза».

Лукская СБ, 20 чал.

**03 снежня**

Да Сусветнага Дня прафілактыкі СНІДу працаўнік Арэхаўскай бібліятэкі правяла актуальную гадзіну «Ведаць, каб не спатыкнуцца». Вучні Арэхаўскай школы спазналі факты гісторыі ўзнікнення хваробы, сучасныя дадзеныя па рэспубліцы, бралі ўдзел у віктарыне. Цікавую гутарку па прафілактыцы ВІЧ правяла медсястра Арэхаўскай амбулаторыі Анікеева Л. К. Прысутныя прагледзелі відэафільм «Гісторыі хвароб. СНІД». На працягу месяца ў бібліятэцы дзейнічала выстава «Поколение NEXT: ваш выбор».

Арэхаўская СБ, 30 чал.

**13 снежня**

На інфармацыйную гадзіну «Путешествие туда без обратно» у бібліятэкі сабраліся вучні сярэдніх і старэйшых класаў. Крыніцы захворвання расчыняліся бібліятэкарам з розных бакоў. Ўвага ў гэтай сувязі надавалася такой праблеме, як наркаманія. Падлеткі прагледзелі відэафильмы пра каварнасць ВІЧ і пагаварылі пра талерантнае стаўленне да хворых. На працягу месяца ў бібліятэцы дзеяла выстава «ВИЧ – избирательный убийца».

Буховіцкая СБ, 12 чал.

## **Мерапрыемствы да Навагодніх святаў**

**08 - 18 снежня**

З 8 снежня Кобрынская дзіцячая бібліятэка пачала цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных навагоднім і калядным святам. Бібліятэку наведалі дзеці дзіцячых садоў горада: № 18, № 13, № 7, № 4, № 20. Іх увазе лялечны тэатр «Казка» падрыхтаваў спектакль «Новогодние приключения Колобка». Маленькія наведвальнікі актыўна адказвалі на пытанні тэатралізованнай віктарыны «Навагоднія цуды», бралі ўдзел у конкурснай праграме чытальнікаў вершаў.

ДБ, 177 чал.

**24 снежня**

На гульнёвую праграму «Путешествие по сказочному царству» прыйшлі вучні малодшых класаў. Пазнавальнае падарожжа па рускіх і беларускіх народных казках і казках А.С. Пушкіна прапанавала сваім маленькім чытачам працаўнік бібліятэкі. Дзеці актыўна адказвалі на пытанні жартоўнай навагодняй віктарыны. У рамках мерапрыемства падводзіліся вынікі конкурсу «Зима в рисунках и стихах». Аўтары самых лепшых малюнкаў атрымалі дыпломы і прызы.

Балоцкая СБ, 20 чал.

**26 снежня**

Святочны пераднавагодні Дзень чытацкага самакіравання прайшоў у Дзівінскай бібліятэцы. Гумарыстычныя віктарыны, тэатралізаваныя выступленні, сцэнкі з пераапрананнем, жартоўныя конкурсы на працягу дня не пакінулі абыякавымі ні аднаго з наведвальнікаў і гасцей.

Дзівінская СБ, 44 чал.

**31 снежня**

Вясёлай атрымалася забаўляльная праграма «Незвычайная экспедыцыя па навагоднім традыцыям». Да святочнага мерапрыемства бібліятэкар падрыхтавала кніжную выставу «Зімовыя прыгоды». Дзеці прымалі актыўны ўдзел у гульні-падарожжы «Самы спрытны», «Усе разам – скок у Новы рок», «Навагодні пірог з сюрпрызам», «Вясёлая эстафета» і у конкурсах «Весёлая чепуха», «Снежинки». Яны з задавальненнем адказвалі на пытанні навагодняй віктарыны «Афрыканскі Новы год». З радасцю дзеці вадзілі карагод і танцавалі на дыскатэцы.

Гарадзецкая СБ, 36 чал.

## **Іншыя мерапрыемствы**

**02 снежня**

Праект «Чтение вслух». Удзельнікамі першай сустрэчы праекта «Чтение вслух» сталі вучні пачатковых класаў ДУА «Гарадзецкі дзіцячы сад - сярэдняя школа», для якіх бібліятэкары падрыхтавалі экскурсію па бібліятэцы, літаратурны агляд па старонках папулярных дзіцячых выданняў. Самі ж чытанні адкрыла намеснік дырэктара па выхаваўчай працы Вярэніч

Т.Н., якая прачытала для юных слухачоў казку С.Т. Аксакава «Аленький цветочек».

Гарадзецкая СБ, 12 чал.

**11 снежня**

Працаўнікі Дзівінскай бібліятэкі для сваіх самых маленькіх чытачоў, вучняў малодшых класаў, правялі святочную акцыю «Передай добро по кругу». Дзеці з задавальненнем дэкламавалі вершы, успаміналі прыказкі і прымаўкі, прысвечаныя зімовай тэматыцы, актыўна адказвалі на пытанні віктарыны «Навагодняя казка». Цікавасць у школьнікаў выклікаў і майстар-клас па навагодняй выцінанцы.

Дзівінская СБ, 35 чал.

**18 снежня**

Бібліятэкар прапанавала пабываць «У гасцях у казкі» самым маленькім наведвальнікам, выхаванцам дзіцячага саду. Правілы паводзін у бібліятэцы дзеці вывучалі, праглядаючы відэапрэзентацыю. Малыяі ахвотна бралі ўдзел у конкурсе загадак «Зимушки Зимы», расказвалі вершы. Апафеозам мерапрыемства стала праслухоўванне і абмеркаванне казкі «Морозко», якую бібліятэкар прачытала па ролях разам з выхавальніцай Конаревай С.А.  У канцы экскурсіі дзеці атрымалі запрашальныя білеты прыйсці ў бібліятэку для сваіх бацькоў.

Верхалеская СБ, 18 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81